Вучымся назіраць



# Што ў нас пад нагамі?

# Якія перад вамі камяні —
# — аднолькавыя ці розныя?
# Чым яны адрозніваюцца адзін ад аднаго?




форма
камяні
памер
колер

# ГРАНІТ







**Граніт вядомы людзям даўно – гэта моцны і прыгожы камень. Залягае ён у глыбіні зямлі і на яе паверхні. З яго могуць быць цэлыя горы.**

**«Граніт» перакладаецца як «крупчасты». Каб зразумець, чаму гэты камень так назвалі, разгледзім яго з дапамогай лупы.**



**У склад граніту ўваходзяць маленькія зярняткі. Чорныя – гэта лушчак. Дробныя зерні, падобныя на шкло, белага або дымчатага колеру – кварц. Ружовая або шэрая частка – палявы шпат. Шпат надае граніту колер і адпаведна граніт бывае шэры або чырвоны.**



лушчак



**КВАРЦ**



## ПАЛЯВЫ ШПАТ





**Граніт складаецца**



# ГРАНІТ













Граніт вельмі трывалы, яго выкарыстоўваюць у будаўніцтве












# ВАПНЯК



**Вапняк часта сустракаецца ў прыродзе. З яго могуць быць складзеныя цэлыя горы, або ён можа залягаць глыбока ў зямлі магутнымі тоўстымі пластамі. З даўніх часоў людзі атрымлівалі з вапняка вапну, вапнавыя растворы, будаўнічыя камяні. Хаты і сцены часта рабілі з гэтага каменя.**





Вапняк складаецца з ракавін марскіх жывел





# ВАПНЯК-РАКУШАЧНІК









Крэйда – гэта разнавіднасць вапняка






Мармур – зменены вапняк. Ён
бывае белым, шэрым, ружовым.

Мармурам аздабляюць сцены
вакзалаў, метро, прыступкі ўсходаў.





# КРАМЕНЬ











# КРАМЕНЬ





З краменя можна высякаць іскры.







# МАЛАЙЦЫ!

